# З УЛІКАМ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ

## Асаблівасці арганізацыі дыферэнцыраванага навучання ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе

*М. Р. СМАЛЯРОЎ,*
*загадчык кабінета перадавога педагагічнага вопыту Магілёўскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У агульным кантэксце сучаснага грамадства працэс навучання арыентуе сферу школьнай адукацыі не столькі на колькасныя аспекты, колькі на паварот да праблем якасці. У апошнія два-тры дзесяцігоддзі ў многіх даследаваннях педагогаў і псіхолагаў дадзены рэкамендацыі па ўдасканаленню навучальна-пазнавальнай дзейнасці вучняў. Вучоныя і практыкі вядуць асцярожны, зацікаўлены пошук шляхоў пераўтварэння дзіцяці ў саўдзельніка яго ж навучання і выхавання. Разбурыліся традыцыйныя ўяўленні аб пазнавальных здольнасцях вучняў. У дыферэнцыраваных умовах навучання ўдалося ўбачыць школьніка, які мае велізарныя інтэлектуальныя патэнцыі. Высветлілася, што дзіця не толькі не пазбягае цяжкасцей, якія сустракаюцца ў час вучобы, але і імкнецца да іх. Яно хоча быць актыўным, авалодваць ведамі ў працэсе самастойнай навучальна-пазнавальнай дзейнасці.

Выявілася неадпаведнасць: школьнік мае вялікія патэнцыяльныя інтэлектуальныя магчымасці, імкнецца вучыцца з захапленнем і прымаць на сябе ўсе цяжкасці вучобы, а традыцыйны яе працэс мае прамалінейны шлях, які мы называем імператыўным. Зыходзячы з гэтага, у даследаванні арганізацыі дыферэнцыраванага навучання ў школах Магілёўскай вобласці намі была пастаўлена задача вызначыць тыя педагагічныя ўмовы, якія дазволілі б улічваць індывідуальныя асаблівасці школьнікаў і на гэтай аснове прапанаваць спосабы стымулявання навучальна-пазнавальнай дзейнасці вучняў на розных узроўнях навучання.

Дыферэнцыраванае навучанне дае магчымасць школьніку вучыцца індывідуальна, рухацца ў аптымальным тэмпе далей у адпаведнасці з прыроднымі задаткамі і схільнасцямі, па-

ступова развіваючы іх да ўзроўню здольнасцей. З улікам усяго гэтага мы вызначылі мэты дыферэнцыяцыі навучання. З псіхолага-педагагічнага пункту гледжання — гэта індывідуалізацыя навучання, заснаваная на стварэнні аптымальных умоў для выяўлення задаткаў, развіцця інтарэсаў і здольнасцей кожнага школьніка. З сацыяльнага — мэтанакіраванае ўздзеянне на фарміраванне творчага, інтэлектуальнага, прафесіянальнага патэнцыялу грамадства з мэтай рацыянальнага выкарыстання магчымасцей кожнага яго члена ў яго ўзаемадзеяннях з соцыумам. З дыдактычнага — вырашэнне наспелых праблем школы шляхам стварэння новай метадычнай сістэмы дыферэнцыраванага навучання, заснаванага на прынцыпова новай матывацыйнай аснове, вылучэння ўнутранай і знешняй форм дыферэнцыяцыі (табліца 1).

**Табліца 1**

| Унутраная дыферэнцыяцыя (без вылучэння стабільных груп) | Узроўневая дыферэнцыяцыя | Знешняя дыферэнцыяцыя (з вылучэннем стабільных груп) | |
|---|---|---|---|
| Дыферэнцыраваны падыход да вучняў | Дзяржаўны ўзровень абавязковай агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі | Электыўная (гібкая) дыферэнцыяцыя. Факультатывы са свабодным выбарам прадметаў навучання | Селектыўная (жорсткая) дыферэнцыяцыя. Профільныя класы |
| | Узроўні павышанай падрыхтоўкі | Курсы па выбару. Свабодны выбар прадметаў на базе інварыянтнага ядра. Пазакласныя формы дзейнасці | Класы з паглыбленым вывучэннем прадметаў |

Унутраная дыферэнцыяцыя — разнастайнае навучанне дастаткова вялікай групы вучняў (класа), падабранай па выпадковых прыкметах. Гэта форма заснавана на як мага больш поўным уліку індывідуальных і групавых асаблівасцей вучняў. Яна мае на ўвазе варыятыўнасць тэмпу вывучэння матэрыялу, дыферэнцыяцыю навучальных устаноў, выбар розных відаў дзейнасці, вызначэнне характару і дазіроўкі дапамогі з боку настаўніка. Пры гэтым магчымы падзел вучняў на групы ўнутры класа з мэтай ажыццяўлення работы з імі на розных узроўнях і з дапамогай розных метадаў. Гэтыя групы, як правіла, мабільныя, гібкія, рухомыя. Асаблівасць унутранай дыферэнцыяцыі на сучасным этапе — яе



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

накіраванасць не толькі на дзяцей, якія адчуваюць цяжкасці ў навучанні, але і на адораных дзяцей.

Унутраная дыферэнцыяцыя ажыццяўляецца як у традыцыйнай форме ўліку індывідуальных асаблівасцей вучняў (дыферэнцыраваны падыход), так і ў форме сістэмы ўзроўневай дыферэнцыяцыі на аснове планавання вынікаў навучання, распрацаванага ў НДІ зместу і метадаў навучання АПН СССР. Традыцыйна сутнасць унутранай дыферэнцыяцыі заключалася ў прымяненні форм і метадаў, якія індывідуальнымі шляхамі з улікам псіхолага-педагагічных асаблівасцей вялі б школьнікаў да аднаго і таго ж узроўню авалодання праграмным матэрыялам. Узроўневая дыферэнцыяцыя мае на ўвазе такую арганізацыю навучання, пры якой школьнікі, што вучацца па адной праграме, маюць права і магчымасць засвойваць яе на розных плануемых узроўнях, але не ніжэй узроўню абавязковых патрабаванняў.

Знешняя дыферэнцыяцыя — працэс навучання з розным зместам адукацыі ў адносна стабільных групах (класах), сфарміраваных на аснове ўліку рэальных магчымасцей школьнікаў.

Знешняя дыферэнцыяцыя можа ажыццяўляцца або ў рамках селектыўнай сістэмы (выбар профілю навучання ці класа з паглыбленым вывучэннем цыкла прадметаў), або ў рамках электыўнай сістэмы (свабодны выбар прадметаў для вывучэння на базе інварыянтнага ядра адукацыі).

Сутнасць знешняй дыферэнцыяцыі заключаецца ў накіраванай спецыялізацыі адукацыі ў вобласці ўстойлівых інтарэсаў, схільнасцей і здольнасцей школьнікаў з мэтай максімальнага іх развіцця ў выбраным напрамку. Розніца профільнага і паглыбленага вывучэння заключаецца ў асноўным у ступені спецыялізацыі, глыбіні адпаведных курсаў і шырыні ахопу імі кантынгенту школьнікаў. Паглыбленае вывучэнне мае на ўвазе дастаткова прасунуты ўзровень падрыхтоўкі школьнікаў, які дае магчымасць дасягнуць высокіх вынікаў і разам з тым абмяжоўвае колькасць вучняў. Профільнае навучанне неабходнае як больш дэмакратычная і шырокая форма фуркацыі школы на старэйшай ступені. Сутнасць гэтага прынцыпу заключаецца ў тым, што на кожнай ступені навучання павінен быць прадстаўлены змест адукацыі, які адпавядае неабходнасці пазнання асноўных элементаў культуры.

У табліцы 2 адлюстраваны падыход да спосабаў фарміравання груп вучняў, іх складу і колькасці. Прынцыпамі і падставамі камплектавання груп могуць быць выпадковыя прыкметы, інтарэсы і схільнасці школьнікаў, дасягнутыя імі поспехі, здольнасці і творчыя магчымасці. У залежнасці ад



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гэтага працэсы дыферэнцыраванага навучання маюць свае арганізацыйныя і метадычныя асаблівасці.

Табліца 2

| Групы вучняў | Прынцыпы камплектавання | Формы дыферэнцыяцыі |
|---|---|---|
| Традыцыйная класная сістэма, гурткі, клубы. Класы з паглыбленым вывучэннем прадметаў | Па выпадковых прыкметах. Па інтарэсах і схільнасцях | Узроўневая дыферэнцыяцыя. Гібкая (электыўная) і ўзроўневая дыферэнцыяцыя |
| Індывідуальныя заняткі з адоранымі школьнікамі | Па інтарэсах, дасягнутых поспехах, здольнасцях | Індывідуалізацыя навучання |

Вопыт школ (класаў) Магілёўскай вобласці з паглыбленым вывучэннем прадметаў паказвае, што змест прадмета, які вывучаецца паглыблена, не павінен прынцыпова адрозніваццa ад курса гэтага прадмета ў звычайных класах. Гэта адносіцца і да профільных класаў. Неабходны педагагічны эфект дасягаўся не шляхам увядзення новых раздзелаў, а за кошт глыбіні засваення матэрыялу, павелічэння колькасці рашаемых задач, лабараторных і практычных работ.

На дадзеным этапе дыферэнцыяцыі гэты тэзіс асабліва актуальны. Паколькі ў школах пакуль што няма спецыяльнага навучальна-метадычнага забеспячэння, профільнае навучанне ажыццяўляецца па дзеючых праграмах, стабільных (або пробных) падручніках, наяўных методыках. Як правіла, пытанні, уключаныя ў дзеючыя праграмы, зразумелыя вучням.

Перад намі ўзнікла праблема абавязковага ядра і варыятыўнай часткі зместу адукацыі ў кожным профілі. Вырашэннем гэтай праблемы з'явіўся модульны прынцып вызначэння зместу адукацыі па кожнаму прадмету. Кожны асобны модуль уяўляе пералік пытанняў дадзенага раздзела і патрабаванняў да ўзроўню авалодання гэтымі пытаннямі. Злучэнне модуляў у праграму залежыць ад спецыфікі навучання ў адпаведным тыпе навучальных устаноў, ад выбранага напрамку і профілю агульнаадукацыйнай школы.

Унутраная ўзроўневая дыферэнцыяцыя патрабаванняў да падрыхтоўкі школьнікаў захоўвае сваё значэнне і ў профільных класах. Неабходна вызначыць для ўсіх профіляў (фізіка-матэматычнага, хіміка-біялагічнага, гуманітарнага, лінгвістычнага, політэхнічнага) свой «стандарт адукацыі» для кожнага прадмета, які ўключае ў сябе базавы ўзровень падрыхтоўкі ў якасці састаўной часткі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вызначэнне зместу прадмета для профіляў — задача няпростая. Аднак пры ўсёй разнастайнасці іх можна вылучыць наступныя тыпы праграм прадметных курсаў у залежнасці ад ролі дысцыпліны ў профілі адукацыі:

1. Прадмет закладвае асновы агульнай культуры школьніка.

2. Прадмет — аснова спецыяльнай падрыхтоўкі школьніка, неабходнай для таго, каб гэты прадмет стаў яго прафесіяй.

3. Прадмет — сродак, неабходны для авалодання іншымі галінамі ведаў (напрыклад, фізіка і матэматыка для інжынера, хімія ці біёлага, матэматыка для лінгвіста).

Такім чынам, вучні гуманітарнага профілю могуць апынуцца перад неабходнасцю выбару праграмы курса матэматыкі трэцяга тыпу, у той час як для вучняў некаторых прыродазнаўчанавуковых профіляў можа быць дастатковым курс матэматыкі першага тыпу. Для класаў з паглыбленым вывучэннем трэба мець гібкія праграмы, якія дазваляюць рэалізаваць розныя метадычныя падыходы. Дапускаецца не толькі паглыбленне, але і пашырэнне навучальнага матэрыялу. Магчымае ўключэнне шэрага пытанняў, якія традыцыйна адносяцца да праграмы ВНУ, калі пры гэтым выйграюць лагічная стройнасць і паўната курса, што асабліва важна для моцных вучняў.

Пры профільным і паглыбленым навучанні неабходна разумнае спалучэнне дыферэнцыяцыі і інтэграцыі зместу адукацыі. Інтэграцыя выклікана неабходнасцю ўстанаўлення арганічных міжпрадметных сувязей, стварэння навуковай карціны свету, цэласнага ўяўлення аб прыродзе і грамадстве. Дыферэнцыяцыя стварае магчымасць паглыбіць веды вучняў у пэўнай, выбранай імі галіне дзейнасці. У прынцыпе гэтыя дзве задачы могуць вырашацца разам.

Спалучэнне дыферэнцыяцыі і інтэграцыі зместу адукацыі неабходна таксама і для пераадолення перагрузак вучняў, звязаных з вырашэннем задачы паглыблення ведаў у выбраных галінах дзейнасці. Дадатковы навучальны час для такога паглыблення можа ўзнікнуць за кошт інтэграцыі зместу адукацыі пры вывучэнні няпрофільных прадметаў (напрыклад, курс «Чалавеказнаўства» для вучняў гуманітарнага профілю).

Метадычныя прынцыпы арганізацыі ўзроўневай дыферэнцыяцыі наступныя:

— фарміраванне апоры, калі ўсе вучні, незалежна ад іх здольнасцей, павінны прайсці этап авалодання апорнымі ведамі і ўменнямі, г. зн. абавязковы ўзровень падрыхтоўкі;



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

— вылучэнне і адкрытае прад'яўленне ўсім удзельнікам навучальнага працэсу абавязковай падрыхтоўкі як асновы дыферэнцыяцыі навучання;

— стварэнне «нажніц» паміж узроўнем абавязковых патрабаванняў і ўзроўнем навучання;

— добраахвотнасць у выбары ўзроўню засваення і справаздачнасці;

— адпаведнасць зместу, кантролю і ацэньвання ведаў узроўневаму падыходу, г. зн. кантроль павінен прадугледжваць праверку ва ўсіх вучняў дасягнення ўзроўню абавязковай падрыхтоўкі.

Гэта дапаўняецца праверкай засваення матэрыялу на больш высокіх узроўнях. Эфектыўным спосабам арганізацыі кантролю, накіраванага на выяўленне абавязковых вынікаў навучання, выступае залiковая сістэма.

У якасці асноўнага шляху ажыццяўлення дыферэнцыяцыі навучання, якая можа выяўляцца ў самых розных формах, мы вылучаем фарміраванне мабільных груп па крытэрыю дасягнення імі ўзроўню абавязковай падрыхтоўкі. Для некаторых прадметаў (родная мова, літаратура) неабходна яшчэ і ацэньванне па відах асноўнай навучальнай дзейнасці, авалоданне якой не можа быць выяўлена толькі ў сітуацыі выніковай заліковай праверкі (напрыклад, тэхніка чытання, чытанне на памяць, пераказ, аналіз і ацэнка мастацкага твора).

Метады навучання павінны абапірацца на дзейсны пачатак, які фарміруе ў вучняў асновы рэфлексіўнага, дыялектычнага мыслення. Настаўнік павінен развіваць разнастайную дзейнасць школьнікаў, дзякуючы якой яны засвойвалі б адпаведныя веды і ўменні. Навучанне ў профільных класах мае спецыфіку, звязаную з інтарэсамі, схільнасцямі і здольнасцямі вучняў да выбраных імі прадметаў. Гэта спецыфіка выяўляецца ў вялікай дозе самастойнай работы вучняў з літаратурай пры вывучэнні новага матэрыялу; рашэнні задач, выкананні эксперыментальных і творчых заданняў; інтэнсіфікацыі навучання за кошт лекцыйна-семінарскай сістэмы, увядзення тэматычных залікаў, павелічэння блокаў засваення; узмацненні індывідуальнай работы выкладчыка з вучнямі як на ўроках, так і ў пазаўрочны час; стварэнні асаблівай атмасферы даверу, супрацоўніцтва, настроенасці на вучобу, працаглую разумовую дзейнасць і працу.

Найбольш характэрнай асаблівасцю работы з вучнямі ў гэтых класах з'яўляецца перанос цэнтра цяжару на самастойную перапрацоўку і засваенне інфармацыі, авалоданне ўменнямі і навыкамі. Настаўнік становіцца ўжо не адзінай і нават не асноўнай крыніцай інфармацыі, а перш за ўсё арганізатарам самастойнай работы вучняў і іх кансультантам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Патрабаванні адкрытасці і варыятыўнасці зместу забяспечваюцца шляхам укаранення гібкага навучальнага плана і праграмы. Выкананне гэтых патрабаванняў дазваляе прыкметна ўзмацніць адаптыўныя магчымасці адукацыі, злучыць змест навучання з нацыянальнымі, рэгіянальнымі і мясцовымі культурамі і традыцыямі, забяспечыць права вучняў выбіраць той змест адукацыі, які іх цікавіць.

За кошт школьнага кампанента навучальнага плана вучням прадастаўляецца выбар форм пазаўрочнай работы (гурткі, факультатывы, дадатковыя заняткі з адстаючымі, кансультацыі), магчымасць дзялення класаў на групы, арганізацыя грамадска карыснай, прадукцыйнай працы. Акрамя названых форм электыўнай дыферэнцыяцыі навучання, ужо ў пачатковай школе ўкараняем селектыўную дыферэнцыяцыю па «неакадэмічных» напрамках шляхам стварэння спецыялізаваных эстэтычных, моўных і спартыўных класаў.

У старэйшых (IX — XI) класах вылучаецца 12 гадзін для арганізацыі профільнага навучання. Акрамя таго, частка часу адводзіцца на ўзмацненне профільнай падрыхтоўкі і арганізацыю на яе аснове паглыбленага вывучэння асобных прадметаў.

Увядзенне навучальных планаў, якія прадугледжваюць у старэйшых класах профільнае навучанне, прыводзіць да скарачэння колькасці гадзін на вывучэнне няпрофільных прадметаў. У выніку пры захаванні традыцыйнай прадметнай сістэмы памяншаецца навучальны час, вылучаемы на кожны прадмет. Выйсце са становішча мы бачым у інтэграцыі зместу адукацыі, распрацоўцы новых інтэграваных курсаў, падрыхтоўцы адпаведнага кадравага і матэрыяльнага забеспячэння школы. Аптымальнае выйсце — павелічэнне навучання на старэйшай ступені школы да 3 — 4 гадоў.

У сувязі з гэтым мы стварылі ў асобных школах класы паглыбленага вывучэння прадметаў (пачынаючы з VII — VIII класа) з працягласцю навучання 3 — 4 гады, улічвалі ўзроставыя асаблівасці вучняў і пачыналі селектыўную дыферэнцыяцыю навучання з 15 гадоў.

Ва ўмовах малакамплектнай сельскай школы найбольш даступнай формай дыферэнцыяцыі навучання з'яўляюцца факультатыўныя заняткі, у тым ліку з вучнямі рознага ўзросту. Невялікая напаўняльнасць класаў стварае спрыяльныя магчымасці для індывідуалізацыі і электыўнай дыферэнцыяцыі навучання.

Наладжваючы дыферэнцыраванае навучанне, мы прымянялі прынцыпова новае навучальна-метадычнае забеспячэнне. Яно адлюстроўвае базісны характар школьнай адукацыі як асноўнага звяна ў сістэме бесперапыннай адукацыі; улічвае ў саставе, структуры і змесце вядучыя віды і спосабы ды-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ферэнцыяцыі навучання на кожнай яго ступені. Дзейнасны падыход рэалізуецца ў гэтым выпадку ў адносінах да спосабаў і форм прад'яўлення навучальнай інфармацыі, да характару і зместу метадычных і дыдактычных дапаможнікаў, да матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння навучальнага працэсу. Узроўневы падыход да структуры і зместу навучальных, метадычных і дыдактычных дапаможнікаў адначасова забяспечвае дасягненне ўзроўню абавязковай падрыхтоўкі і магчымасць авалодання вучнямі больш высокімі ступенямі засваення зместу адукацыі.

Варыятыўны падыход да канструявання навучальна-метадычных дапаможнікаў выяўляецца: у распрацоўцы альтэрнатыўных варыянтаў навучальна-метадычнага забеспячэння для аднаго і таго ж курса; навучальна-метадычных камплектаў, якія адпавядаюць розным варыянтам прадметнай структуры зместу агульнай сярэдняй адукацыі і электыўнай сістэме знешняй дыферэнцыяцыі адукацыі, што мае на ўвазе пры наяўнасці зададзенага варыятыўнага набору навучальных прадметаў як абавязковы, так і свабодны выбар вучнямі пэўнай колькасці навучальных курсаў, якія ахопліваюць розныя галіны ведаў і віды дзейнасці; у рэалізацыі модульнага прынцыпу пабудовы навучальна-выхаваўчага працэсу, накіраванага на ўзмацненне адаптыўных магчымасцей прапануемых варыянтаў у прымяненні да канкрэтных умоў педагагічнага працэсу.

Асновай для выбару таго ці іншага профілю на старэйшай ступені школьнай адукацыі з'яўляецца жаданне саміх вучняў, што аказвае станоўчы ўплыў на фарміраванне матывацыі навучальнай дзейнасці (табліца 3).

Табліца 3

**Структура матывацыі навучання**




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Камплектаванне класаў з паглыбленым вывучэннем прадмета, як правіла, праводзім на аснове адбору вучняў. Асноўны кантынгент набіраем з ліку вучняў, якія наведвалі занядкі адпаведных гурткоў і факультатываў, удзельнікаў алімпіяд, прадметных конкурсаў. Для навічкоў і тых, хто яшчэ не вызначыўся ў профілі навучання, наладжваем адкрытыя конкурсы, што ўключаюць субяседаванне і заліковыя работы па прафілюючых прадметах.

Эфектыўным спосабам адбору вучняў у такія класы служыць летняя фізіка-матэматычная школа, у якой на працягу 3 — 4 тыдняў сіламі выкладчыкаў і студэнтаў Магілёўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. Куляшова праводзяцца спецыяльныя заняткі і заліковыя работы з выпускнікамі IX класаў. Важнай перавагай гэтай формы адбору, апрабаванай на працягу 10 гадоў у СШ № 1, 23, 36 г. Магілёва, з'яўляецца тая акалічнасць, што тут фіксуецца не толькі зыходны ўзровень ведаў вучняў, але і іх здольнасць засвойваць новыя веды ў час вучобы ў летняй школе.

Профільная дыферэнцыяцыя навучання, класы з паглыбленым вывучэннем прадмета ставяць сёння больш вострa праблему матэрыяльнага забеспячэння кабінетаў інфарматыкі, лабараторый, доследных участкаў, вытворчых майстэрняў для профільнай і прафесіянальнай падрыхтоўкі, школьных бібліятэк.

Аналіз вопыту работы настаўнікаў у дыферэнцыраваных класах сведчыць аб розным падыходзе дзяцей да выбару профілю навучання. Часцей за ўсё перавага аддаецца матэматыцы і фізіцы. І цікавяцца гэтымі прадметамі, як правіла, моцныя вучні. Яны вучацца з цікавасцю, ахвотна і мэтанакіравана, звязваючы з любімымі прадметамі свае планы на будучыню. Менавіта з такіх вучняў дэлегуюцца ўдзельнікі конкурсаў і алімпіяд, канферэнцый і факультатываў. Вучні СШ № 23 г. Магілёва працуюць у навуковым таварыстве пры педагагічным інстытуце. Каля 30 % школьнікаў хаця і не звязваюць сваю будучую прафесію з названымі вышэй навукамі, якія лічацца прэстыжнымі, вучацца аднолькава паспяхова па ўсіх прадметах. Невялікая частка вучняў аказалася непадрыхтаванай да вучобы па гэтаму профілю. Неабходна адзначыць непахіснасць бацькоў, якая часта з'яўляецца рашаючым фактарам пры выбары напрамку.

На другое месца выйшаў хіміка-біялагічны напрамак. А вось павышаная цікавасць грамадства да сваёй гісторыі і літаратуры не атрымала адэкватнага адлюстравання ў інтарэсах школьнікаў. Грамадска-гуманітарны напрамак заняў толькі трэцяе месца. У класах тэхніка-канструктарскага напрамку ў адных школах апынуліся вучні, якія страцілі інтарэс да вучобы, мелі слабыя веды; у другіх — моцныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вучні, якія лічылі, што тэхнік-канструктар павінен ведаць не толькі спецыяльныя прадметы, але і фізіку, і матэматыку. Гэтых вучняў чакала расчараванне, таму што дадзеныя прадметы вывучаліся ў аб'ёме няпрофільных класаў. Выйсце было знойдзена наступным чынам: тыя вучні, якія маюць сур'ёзны намер атрымаць вышэйшую тэхнічную адукацыю, паступаюць у абласны тэхнічны ліцэй пры машынабудаўнічым інстытуце, усе астатнія — атрымліваюць паглыбленую працоўную падрыхтоўку, азы рабочых прафесій, неабходных гораду і вобласці.

Класы эстэтычнага напрамку малалікія ў сувязі з адсутнасцю ў большасці вучняў ярка выражаных мастацкіх і музычных здольнасцей.

Апытанне вучняў восьмых класаў выявіла нямала цяжкасцей, з якімі яны сустракаюцца пры выбары профілю навучання. У прыватнасці, інтарэсы, здольнасці вучняў не заўсёды адпавядаюць выбранаму профілю. Гэты факт прымусіў нас унесці карэктывы ў наменклатуру навучальных прадметаў, значна ўзмацніць работу па падрыхтоўцы вучняў да выбару профілю навучання, вывучэнню іх здольнасцей, схільнасцей, магчымасцей. Перад бацькамі была пастаўлена задача не толькі дапамагаць у вызначэнні напрамку навучання дзяцей, але і забяспечыць іх сацыяльную і псіхалагічную абароненасць ад ціску як саміх бацькоў, так і настаўнікаў.

Логіка падрыхтоўкі вучняў да выбару напрамку навучання заключалася ў наступным: на першым этапе, які ахоплівае пачатковую школу, праводзіцца спецыяльная работа па вывучэнню індывідуальных асаблівасцей дзяцей, іх здольнасцей і інтарэсаў; на другім — вучні ацэньваюць свае здольнасці, знаёмяцца з рэкамендацыямі настаўнікаў, класных кіраўнікоў; трэці этап уяўляе непасрэдную падрыхтоўку да выбару профілю навучання, якая ахоплівае навучальны год. У канцы года запаўняюцца анкеты, карты абследавання, у асобных выпадках вучні рашаюць тэставыя задачы. Вызначальнае месца на ўсіх этапах належыць мэтанакіраванай выхаваўчай рабоце па дыягностыцы асобы вучня. Гэту работу выконваюць у першую чаргу настаўнікі, класныя кіраўнікі, школьныя псіхолагі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова